Цана асобнага нумару 20 гр.

Opłatę pocztową uiszczono ryczałtem.

ПРАВА ПРАЦЫ

Выходзіць два разы у тыдзень

Адрэс Рэдакцыі і Адміністрацыі: Вільня, Віленская вул. 12—6 (Wileńska 12. m. 6) Рэдакцыя адчынена ад 12 да 2 гадз. штодна, апрача сьвяточных дзён. Адміністр. ад 9 да 3.	Падпіска на адзін месяц з дастаўкай да хаты 1 зл. 50 гр. Для заграніцы ўдвая даражэй. Перамена адрэсу 30 гр.	Няпрынятыя ў друк рукапісы назад не вяртаюцца. Аплата надрукаван. залежыць ад Рэдакцыі.	Цана абвестак: перад тэкстам 25 грош., сярод тэксту 20 грошы і н 4 стр. 15 гр. за радок пэтыту ў 1 калёнку.

№ 2 Вільня, Субота 10-га сьнежня 1927 г. Год I

У ваблiччу выбараў.

Гэтымі днямі распачалася ўжо запраўдная выбарная кампанія.

5 сьнежня агалошан дэкрэт прэзыдэнта, які вызначае выбары ў Сойм на 4 і ў Сэнат на 11 сакавіка 1928 г.

У ваблiччу выбараў мы мусіма выразна даць сабе справаздачу аб значэньні гэтых выбараў і аб мэтах, якія мы ставім сабе ў гэтай барацьбе.

Якое-ж значэньне маюць для працоўных мас выбары ў парлямант наагул? Якое значэньне будуць мець для сялянска-работніцкіх мас гэтыя выбары ў асаблівасьці?

Ці могуць сялянска-работніцкія масы спадзявацца ад выніку выбараў свайго вызваленьня з пад ярма сацыяльнай і нацыянальнай нявол і, з пад ярма вызыску і гнету? Не! Гэта вачавідна. Аб гэтым сьведчыць, каб не далека шукаць, хоць бы вынікі прошлых выбараў. Толькі шляхам упорной, штодзеннай труднай барацьбы за свае інтэрэсы могуць працоўныя масы палепшыць свае жыцьцё. Мала таго, толькі ў гэтай штодзеннай барацьбе з сваімі вызыскiвачамі і прыгнятацелямі работн.-сялянскія масы могуць стварыць, выкаваць, выхаваць *свае арганізацыі, свае аружжа для здабыцьця сваіх правоў*. Толькі ў гэтай барацьбе шырокія працоўныя масы здабудуць навык і ўменьне да *арганізаванай, салідарнай, масавай дзейнасьці, гэтай запраўднай умовы іх вызваленьня*. Тым больш няма чаго сялянска-работніцкім масам марочыць сябе ілюзыямі, што да вынікаў гэтых выбараў.

Вось што кажа аб іх орган „Санацыі“ афіцыёз фашыстаўскага ўраду „Głos Prawdy“ (На пярэдадні выбараў; № 327): „Урадавы блёк, калі хоча споўніць сваю гістарычную ролю, павінен ня даць сябе ўцягнуць у тон дэмагогіі і не баяцца паражэньня. Паражэньне ў гэтых выбарах, навет у будучых, не вырашае аб лёсе Польшчы, *не вырашае навет аб лёсе ўраду (падкрэсьлена намі — Рэд)*. Таму паражэньне або пабеда ўрадавага блёку будзе вырашаць *толькі аб лёсе прышлага Сойму (падкр. намі—Рэд.)*. Таму творцы блёку павінны помніць, *што важнейшым за вынікі выбараў зьяўляецца мэтода агітацыі* (падкр. намі—Рэд).

Гэтак сама ясна павінны паставіць справу і мы.

Для справы вызваленьня сялянска-работніцкіх мас ня важна адным мандатам болей ці меней. Соймавымі прамовамі жыцьця сялянска-работніцкіх мас не палепшыш. Гэтай манок карыстаюцца палітычныя спэкулянты на народнай цемнаце і несьвядомасьці прыдбаць „пярнкі“ ці хоць-бы „падушачкі“, накшталт паноў з „Сялянскай Нівы“ (гл. „Першы Крок“, Чаму блёкуемся і інш). Паўлюкевічаў ды Умястоўскіх. Нашым заданьнем, нашай мэтай у часе выбарнай кампаніі лічым здэмаскаваньне гэтай ілжы паноў Ярэмічаў, Рагуляў, кс. Станкевічаў, Умястоўскіх і ім падобных. Для сялянска-работніцкіх мас выбары зьяўляюцца аглядам сваіх сілаў, свае сьвядомасьці, свае дасьпеласьці. „Ня могуць яны і ня будуць нічым балей у сучаснай дзяржаве; але гэта выстарчыць. У дзень, калі градусьнік усеагульнага выбарнага права будзе паказваць на боку работнікаў пункт кіпеньня, гэтыя апошнія так сама, як і капіталісты, будуць ведаць, што гэта знача“—як казаў Энгельс.

Нашым заданьнем зьяўляюцца не абяцанкі „манны нябеснай“ сялянска-работніцкім масам, як вынік выбараў, а скіраваньне іх падзей у бок іх уласнай труднай цяжкай штодзеннай барацьбы з сваім вызыскiвачамі і прыгоньнікамі на шлях будовы сваіх арганізацыяў ва ўсіх галінах працы і жыцьця.

Замест блёку (ў пагоне за мандатам) з жыдоўскай і нямецкай буржуазіяй, якая навет цяпер у часе выбарнай кампаніі заяўляе, што падтрымае „надалей усе пачынаньні ўраду“ (сучаснага);— замест „Краёвай Еднасьці“, „братэрства народаў“, „братаньня з польскім селянінам“ (у асобе вайсковага асадніка Валерона) ў імя зьвінячага мэтала, — нашым заданьнем, нашай мэтай у выбарнай кампаніі ёсьць усьведамленьне нашых беларускіх сялянска-работніцкіх мас у неабходнасьці аб'яднаньня з працоўнымі ўсей Польшчы для барацьбы за сацыяльнае і нацыянальнае вызваленьне. Гэта наш шлях, гэта наша заданьне ў гэтай выбарнай кампаніі. Не мандаты (адным болей або меней), а ўсьведамленьне сялянска-работніцкіх мас нам важна. Не „падушачкі“ для соймавых шахрайстваў і торгаў (долю працоўным ня выторгуеш), а выкарыстаньне соймавай трыбуны для ўсьведамленьня і мабілізацыі беларускіх сялянска-работніцкіх мас ў імя супольнай барацьбы з працоўнымі ўсей Польшчы за іх і свае сацыяльнае і нацыянальнае вызваленьне.

Вось нашы мэты і шлях.

Сэсія Рады Лігі Нацыяў.

5-га сьнежня распачалася чарговая сэсія Рады Лігі Нацыяў. Галоўнай—бо запраўды ня толькі сэнсацыйнай, але і паважна пагражаючай міру, справай, якую мае разглядзець, калі ня вырашыць Рада, зьяўляецца справа польска-літоўскага канфлікту. У апошнія часы абодвы спорчыя бакі зрабілі, здаецца, усё магчымае, каб паставіць палючую справу, як кажуць „на вастрыё мяча“...

Рада дагэтуль яшчэ зусім не падрыхтавалася да разгляду справы. І толькі цяпер паміж зьехаўшыміся кiруючымі Эўропай дыпляматамі пачаліся прыватныя гутаркі, у якіх пэўне-ж будзе сьпярша вырашана пасутнасьці справа, якая фармальна пасьля гэтага будзе праведзена праз Раду. Сэсія Рады мае быць асабліва „гарачай“, бо ў дыскусіі маюць прыняць учасьце абедзьве стараны, якія знаходзяцца адна з аднэй — „у стане сталай вайны“, ды яшчэ асабіста прадстаўленымі самімі сваімі так страшэнна заеўшыміся адзін з адным павадырамі: Вальдэмарасам і Пілсудскім.

Ці Рада будзе разглядаць польска-літоўскі спор у-ва ўсей цэласьці і паўнаце, гэта—няведама. Бо-ж, здаецца, абедзьве стараны робяць „засьцярогі“ проці гэтага: Польшча выключае з разгляду справу Віленшчыны, дамагаючыся толькі спыненьня „стану вайны“ з боку Літвы, як „нэдарэчнага, недазволенага Статутам Лігі, шкоднага і небясьпечнага“. Здаецца, у апошнім дамаганьні Польшчы, яна знаходзіць падтрыманьне з боку амаль ня ўсіх сяброў Рады, а навет і астаўшагася ў Жэнэве—дзеля ўплываньня на пастанову Рады старшыні радавай дэлегацыі — на канфэрэнцыі ў справе разбраеньня—Літвінава. Апошні, як падалі тэлеграмы, заявіў, што спыненьне „стану вайны“ зусім не азначае з боку Літвы — прызнаньня за Польшчай Віленшчыны. Бо-ж напрыклад, — Рады не знаходзяцца з Румыніяй у стане вайны, але ніколі не прызнавалі і ня прызнаюць захвату Румыніяй Бэсарабіі. Дык трэба думаць, што гэтае пытаньне будзе вырашана—паводле польскай думкі, як агульна-карысная. Іншая рэч—справа ўзнаўленьня нармальных стасункаў паміж Літвой і Польшчай. Польшча лучыць гэтую справу з справай спыненьня стану вайны. Але літоўскі ўрад з свайго боку, — лучыць узнаўленьне стасункаў — з справай аддачы Віленшчыны Літве. Трэба сьцьвярдзіць, што, калі Рада можа прымусіць сваей пастановай Літву спыніць стан вайны з Польшчай—пад пагрозай выключэньня з Лігі, а можа і далейшых рэпрэсіяў, дык змусіць Літву да ўзнаўленьня нармальных стасункаў з Польшчай сваей пастановай—з боку чыста праўнага — Рада ня можа. Бо ж сама Англія парвала нармальныя стасункі з СССР, не аб'яўляючы яму вайны, і гэта — яе ўласная справа — самастойнага паразуменьня з СССР. Іншая рэч, калі Рада аднача́сна націсьне на Літву і на Польшчу, каб неяк дабравольна пагадзіліся. А тады—ведама-ж — ізноў выплыве на чаргу справа віленская.

З другога боку, літоўскі ўрад трэбуе, каб Рада разглядзела пасутнасьці тры яго скаргі на паступаньне польскага ўраду ў Віленшчыне, адносна да літоўскіх дзеячоў. Як ведама, цэлы рад выдатнейшых літоўскіх дзеячоў нашага краю былі—на падставе „ўзаемнасьці“ — за тасаваныя быццам у Літве страшэнныя гвалты над польскімі вучыцялямі,—пасьля вобыскаў, арыштаваны ды пасаджаны па вастрогах. Як сьцьвярдзілі газэты, весткі аб гвалтах над польскімі вучыцялямі і іх прысланы быццам з літоўскага вастрогу супольны ліст, аказаліся сфальшаванымі. Ліст быў проста сфабрыкаваны — пэўна-ж у мэтах завастрэньня канфлікту, а можа,—і—спраўкаваньня вайны. У гэтай справе пазыцыя Польшчы ўжо — значна цяжэйшая: рэпрэсіі польскага ўраду да сваіх грамадзянаў — за—хай навет гвалты літоўскага ўраду да сваіх палякоў гэта-ж—дзікая „помста“, наагул нетасаваная ў культурным міжнародным сужыцьці...

Але трэцяя нота — скарга Вальдэмараса на польскі ўрад значна пашырае абвіненьні, якія ў першай высунула Літва проці Польшчы ды якімі сьпярша літоўскі ўрад хацеў абмяжавацца, не дапускаючы ў Лізе навет перагляду цяпер віленскай справы—у адсутнасьці ў складзе Рады—СССР.

Трэцяя скарга Літвы — у зьвязку з віленскай дэманстрацыяй Пілсудскага — зьмяшчае ўжо выразнае абвінавачаньне Польшчы ў падрыхтаваньні ваеннага замаху на незалежнасьць літоўскай рэспублікі... Літоўскі ўрад у гэтай ноце кажа, што Польшча арганізавала зьезд эмігрантаў у Рызе, дый што польскі ўрад „арганізуе ў Віленшчыне азброеныя банды быццам дэзэртыраў з літоўскай арміі“ — проці Літвы. Сьцьвярджаючы, што ніякіх дэзэртыраў у літоўскай арміі няма, Вальдэмарас даводзіць з гэтых вестак, што польскі ўрад сам творыць „літоўскую армію“—для паходу проці Літвы..:

Пасьля ведамай „гутаркі“ марш. Пілсудскага з журналістамі (падаем яе ў скароце ў аддзеле палітычнага агляду), польскаму ўраду значна цяжэй будзе давясьці свае цалком мірныя намеры адносна да Літвы...

Гэткім чынам — падсумоўваючы ўсё разам, бачым, што Рада Лігі павіна будзе разглядзець усю справу польска-літоўскіх адносінаў, яўна пагражаючых вайной,—у-ва ўсей яе зложнасьці і цэласьці. Але вось, — ці здолее Рада вырашыць гэтую справу цалком, на гэта, зразумела,—вельмі мала надзеі. Літоўская справа будзе, відаць, толькі крыху залагоджана — дзякуючы пэўнаму палепшаньню польска нямецкіх і польска-радавых адносінаў,—але ўвесь той вузел супярэчных інтарэсаў, які завязаны ў Коўні дый у Вільні паміж галоўнымі дзяржавамі ўсходняй Эўропы, разьвязаны ня будзе... Чаму? — ці дзеля таго, што ён, як цьвердзяць „няверуючыя“ можа быць толькі — „разрублены мячом“,—ня ведама...

„Гутарка марш. Пілсудскага—у польска-літоўскай справе“.

Старшыня польскага ўраду марш. Пілсудскі прадыктаваў „ПАТ“ — у тлумачэньне польскай ноты — сваю заяву да сусьветнай апініі ў справе канфлікту з Літвой — такога зьместу. „Стан вайны“, утрымліваны Літвой адносна да Польшчы—выразная азнака „хваробы гэтага кутка на паверхні зямлі“. Гэты „стан вайны“ робіць нашыя граніцы з Літвой—непадобнымі да ўсіх іншых на сьвеце, стварае вельмі ненармальныя, амаль запраўды-ж не ваенныя, варункі жыцьця перадусім у пагранічным пасе. Польшча аднак жа мела цярплівасьць да апошняга часу, як мага лагодзючы ўсе праваку ючыя „памылкі“ літоўскага ўраду. Урэшце, узьняўшы проці Польшчы скаргі ў Лізе, Вальдэмарас папсаваў сабе нэрвы да таго, што распачаў мабілізацыю проці Польшчы... „Калі я даведаўся аб гэтым, дык цэлую ноч ня спаў, шукаючы рашэньня. Бо-ж я ведаў, якія могуць быць рэзультаты спазьненьня нашай мабілізацыі. Ня гледзячы на тое, што я ведаў, што перамога будзе ў хуткім часе маей, але я павінен быў дрыжаць пры аднэй думцы, што я ня здолею ў час прыйсьці на помач тым часткам нашага краю, якія будуць ахоплены пажарам вайны.. Розум і лёгіка вайны кажуць—сьпяшыць з адказам на мабілізацыю, каб выйграць час“. „Але на гэты раз справа "стану вайны" аддана на разгляд міжнароднай установы, дзе дзеюць законы міру, а не вайны“. Дык, стрымаўшыся „на гэты раз“ ад „адказу“ Літве, марш. Пілсудскі зателеграфаваў францускаму паслу, што—„пастанавіў не рабіць мабілізацыі, што было „найпрасьцейшым рашэньнем“ чакаючы на вырашэньне справы Лігай“, кіруючыся пры гэтым — „вышэйшымі інтарэсамі і лёгікай дзяржавы“.

Далей марш. Пілсудкі востра вылаяў Вальдэмараса асабіста, назваўшы яго „безчэльным“ і „вар'ятам“, „над-патрыётам“, які сьпярша быў расейцам, пасьля немцам, а ўрэшце літоўцам... Лічучы, відаць, запраўды Вальдэмараса „безадказным вар'ятам“, які можа якім-сьці гвалтам спраўкаваць вайну, марш. Пілсудскі—„з вялікім цяжарам у душы.... выбраў пасьля доўгай барацьбы з самім сабой — „вышэйшую над вайной праўду міру“... Але цяпер — справа Лігі, каб „меч вар'ята, пагражаючы Польшчы“, не зрабіў ёй шкоды. У канцы марш. Пілсудскі заклікае грамадзян Польшчы, каб былі спакойныя—бо-ж гэты спакой—адзнака запраўднай сілы...

Заграніччная прэса—аб заяве маршалка Пілсудскага.

Францyская прэса наагул захопліваецца заявай Пілсудскага, бачучы ў ёй „уяўленьне рашучага імкненьня Польшчы да міру“. Але некаторыя газэты даходзяць у гэтым „захопленьні“ да таго, што радзяць Польшчы... ня вельмі цэрамоніцца з Літвой, з „гэтым творам нямецкага кайзэра ў часе вайны“... Нямецкая прэса падчыркiвае перадусім—„нячуваныя ў міжнародных стасунках лаянкі, якіх дапусьціўся марш. Пілсудскі адносна да асобы прэм'ера ўраду замежнай дзяржавы“. Газэты падчыркiваюць — „характэр пэўнага ўльтыматуму Радзе Лігі“. Гэта значыць—быццам ён кажа Лізе: я пачакаю. Калі ты здолееш вырашыць справу,—на карысьць Польшчы, добра; калі не, дык... прыдзецца вырашыць справу самаму“... Газэты пішуць, што Пілсудскі так пагардліва трактуе Вальдэмараса — бо чуе за сабой падтрыманьне з боку вялікіх дзяржаў — Францыі і Англіі. Але такі востры тон ды „скрытыя пагрозы вайны“ могуць вельмі зашкодзіць Пілсудскаму ў Лізе...

Радавая прэса вельмі востра крытыкуе польскую ноту і „гутарку Пілсудскага, якія—зусім не супакойваюць публічную апінію ў СССР, але наадварот — страшэнна завастрылі яе трывогу. Рады — рашуча проці таго, каб літоўскую справу вырашала Ліга, дзе — ня толькі няма СССР, але кiруючую ролю іграюць дзяржавы, яўна ці скрыта варожыя да СССР. Справа спору Літвы з Польшчай можа быць вырашана толькі свабодным паразуменьнем іх абодвух — без усялякага націску з боку трэціх дзяржаваў. Усе радавыя адказныя галасы аднолькава заяўляюць, што Рады рашуча выступяць на абарону літоўскай незалежнасьці ды нятыкальнасьці — у разе якой-нябудзь пагрозы. Дык — „небясьпека зусім яшчэ ня спынена“, так заключае радавая прэса свой агляд польска-літоўскага канфлікту.

Пілсудскі асабіста едзе ў Жэнэву.

М. Пілсудскі быццам ужо пастанавіў рашуча ехаць асабіста ў Жэнэву на сэсію Рады. Толькі сьпярша ён чакае, каб паехаўшы наперад мін. Залескі тэлеграфаваў яму,— „якія наагул настроі пануюць сярод радных Лігі...

Першая заява Вальдэмараса ў Жэнэве.

Як толькі Вальдэмарас прыехаў у Жэнэву, зараз жа заявіў акружыўшым яго журналістам, што Літва гатова паразумецца з Польшчай, але — на падставе спаўненьня польскім урадам законных дамаганьняў Літвы.

Далейшыя сэнсацыйныя заявы Вальдэмараса.

Супрацоўніку вялікай чыкагскай (амэрыканскай) газэты Вальдэмарас заявіў, што

Літва высоўвае новы праект вырашэньня сваей справы.—Літва і Віленшчына злучаюцца ўзорам Швайцарыі ў Саюзную Рэспубліку, якой павінна быць дадзена міжнародавая гарантыя нятыкальнасьці (як Швайцарыі, якая дзеля таго ня мае арміі). За гэта Літва гатова абавязацца не заключаць ніякіх саюзаў з замежнымі дзяржавамі, за выняткам толькі трактатаў аб палюбоўных судох у спорных справах—з ССРР, Нямеччынай, Польшчай і Латвіяй. Далей—Літва згадзілася б тады на міжнародавы кантроль над яе замежнай палітыкай, які быў-бы даручавы спэцыяльнай камісіі Лігі Нацыяў.

Гутаркі і адказы Вальдэмараса—на польскія галасы.

У цэлым сьцягу „гутарак“ з журналістамі Вальдэмарас—у адказ на закіды з боку м. Пілсудскага—перадусім заяўляе, што ніякай мабілізацыі ён не рабіў: весткі гэтыя —фальшывыя. Але „з боку польскага, як падчыркнуў сам Пілсудскі, былі прыняты экстраныя ваенныя меры“...

Што датычыць „стану вайны паміж Літвой і Польшчай“, дык ясна, што гэты „стан вайны мае выключна праўна - палітычны зьмест, але зусім не практычна ваенны“. Зьліквідаваньне гэтага стану можа быць дакажана толькі пасьля—развязаньня віленскай справы“. У другой заяве Вальдэмарас згаджаецца перадаць спор Літвы з Польшчай на разгляд міжнародавай канфэрэнцыі, але—толькі такой, у склад якой уваходзіла б і Родавая Расея, ня кажучы ўжо аб Нямеччыне,—як дзяржавы, найбольш заінтэрэсаваныя ў добрым вырашэньні справы. Рада Лігі ня можа вырашаць гэтую справу, бо ССРР не ўваходзіць у склад Лігі. Пачын-жа зьліквідаваньня канфлікту павінен выйсьці з Польшчы, бо-ж Польшча нарушыла ў 1920 г. правы Літвы дый стварыла той стан вайны, у якім цяпер апынулася Літва. Закіды Польшчы, быццам „стан вайны“ пагражае вайной —толькі „йгра словамі“—бо-ж ведама добра, што паміж Польшчай і Літвой існуюць розныя трактаты, паміж іншым—абавязываючыя як Літву таксама і Польшчу — не тасаваць ваенных мераў дзеля разьвязаньня спорных справаў. Польшча ў апошні час распачала пляновую акцыю — з мэтай узрыву знутры літоўскай рэспублікі, каб мець прадлог умяшацца ў справы аружна.—Дзеля гэтага асабліва праца скіроўвалася на раскол у літоўскай арміі. Але ўсе гэтыя высілкі — скончыліся крахам. — Найлепшы доказ сілы ўраду ды спакою у Літве, гэта тое, што ён, Вальдэмарас—выехаў з краю ў Жэнэву, не пабаяўшыся пакінуць Коўну.

Вестка аб катаваньні вучыцялёў-палякаў была фальшывая: сфабрыкавана была, каб стварыць „прычыну“ для рэпрэсіяў проці літоўцаў у Польшчы.

Што-ж датычыць некарэктных па форме выражэньняў м. Пілсудскага адносна яго, Вальдэмараса, асобы, дык гэткія рэчы казаць, як роўна-ж і на іх адказываць ніжэй годнасьці кіруючага палітычнага дзеяча... І ў канцы Вальд. сьцьвярдзіў, што — аніводны жаўнер ня быў змабілізаваны ў Літве.—„Нажаль, не магу таго ж сьцьвярдзіць адносна да Польшчы“. Стасункі Літвы з Нямеччынай —пасьля стварэньня новага „дырэктарыяту“ ў Клайпэдзе—найлепшыя...

„Камітэт 5-ёх“ — у справе канфлікту.

Нямецкая прэса даведалася аб намеры Рады Лігі стварыць „камітэт, зложаны з 5“—праўнікаў-прадстаўнікоў — Англіі, Францыі, Нямеччыны, Італіі і Японіі, які-б апрацаваў для Рады праект праўнага разьвязаньня спору паміж Літвой і Польшчай.

Марш. Пілсудскі запрашаецца асабіста ў Жэнэву Чэмбэрленам.

Адна з польскіх газэтаў даведалася, быццам марш. Пілсудскі толькі што атрымаў ад самога Чэмбэрлена пісьмо, у якім той запрашае старшыню польскага ўраду ў Жэнэву, дзе Чэмбэрлен хацеў-бы пагутарыць з ім—ня толькі ў справе польска-літоўскага спору, але і наагул — у справах агульна-эўрапэйскай палітыкі...

„Працавіты дзень Брыяна“.

З Жэнэвы пішуць, што Брыян — у характэры пасрэдніка паміж Літвой і Польшчай—мае шмат працы. Асабліва працавіты дзень яго быў—4 сьнежня, калі ён канфэраваў—з Чэмбэрленам, Залескім, Штрэзэманам, Політісам, Літвінавым і Луначарскім. — Пэўне ж усё—у літоўскай справе. Быццам Брыян асабліва націскаў на радавых дэлегатаў, каб не адхіляліся ад цеснай стычнасьці з працай Рады Лігі ў справе... „ўкрапленьня міру на Усходзе Эўропы“...

Распачацьце сэсіі Рады Лігі Нацыяў.

5 сьнежня распачалася сэсія Рады Лігі Нацыяў. Справа Літвы—Польшчы назначана была сьпярша на аўторак — 6, пасьля перанесена на 8.

Брыян, як пішуць газэты, быццам заявіў, што — вырашэньне польска-літоўскага спору—пытаньне жыцьця ці сьмерці для самай Лігі...

Спатканьне Літвінава з Чэмбэрленам у Жэнэве.

У Жэнэве адбылося спатканьне і даўжэйшая гутарка паміж Літвінавым і Чэмбэрленам, аб „немагчымасьці“ якой так многа пісала польская прэса.. Пасьля гутаркі, праўда, англійскае агенства паведаміла, што гутарка не давяла да нейкага паразуменьня ў справе ўзнаўленьня стасункаў паміж Англіяй і Радамі—бо „не знайшла падставы дзеля гэтага“.

Брыян мае быць „пасрэднікам“ паміж Польшчай і Літвой.

Францускія палітычныя кругі быццам вельмі „ружова“ глядзяць на магчымасьць поўнага паразуменьня між Польшчай і Літвой—у Жэнэве.

Сам Брыян мае ўзяць на сябе быццам цяжкую ролю пасрэдніка, на што ён аднак-жа —вялікі штукар. Ён мае быццам зрабіць магчымым—беспасрэднія асабістыя гутаркі Пілсудскага з Вальдэмарасам,—яго гэта—любімы спосаб.

Але ж Пілсудскі якраз зрабіў усё магчымае, каб зрабіць гэтыя асабістыя гутаркі з Вальдэмарасам—немагчымымі...

Палітычная хроніка.

У Польшчы.

Выбарчы календар, абвешчаны ў „Dzienniku Ustaw Rzeczypospolitej Nr 107“ 5 сьнежня 1927 г.

13 сьнежня. 8 найбольшых польскіх клюбаў прадстаўляе Генаральнаму Выбарчаму камісару 8 сяброў дзяржаўнае выбарчае камісіі і гэтулькі-ж заступнікаў.

15 сьнежня. Генаральны Выбарчы Камісар на прапанову старшыні адпаведнага апэляцыйнага суду назначае павадыроў акружных выбарчых камісіяў (Ваявода, Камісар Ураду) назначае па 1 сябру акружных выб. камісіяў.

Адміністрацыйныя ўлады І інстанцыі абвяшчаюць ува ўсіх воласьцях падзел іх на выбарчыя абводы, з вызначэньнем выбарчых памешканьняў і кватэры абвадовае выбарчае камісіі. Аб павышшым адначасна гэтая самая ўлада паведамляе павадыра (старшыню) Акружнае Выбарчае Камісіі і Галоўны Статыстычны Урад. Генаральны Выбарчы Камісар абвяшчае ў „Monitorze Polskim“ склад асобаў і ўраловае памешканьне дзяржаўнае выбарчае камісіі, такжа мейсца, час, спосаб і апошні тэрмін падаваньня дзяржаўных сьпіскаў кандыдатаў.

17 сьнежня. Генаральны Выбарчы Камісар абвяшчае ў ваяводзкім „Dzienniku Urzędowym“ назначэньне павадыроў (старшынь) акружных выбарчых камісіяў, іх заступнікаў (Ваявода, Камісар Ураду) абвяшчае назначэньне сяброў акружных выбарчых камісіяў, праз вызначэньне.

Месцавыя рады, сабраньні адносных воласьцей, выбіраюць сяброў акружной выбарчай камісіі.

19 сьнежня. Павадыр Акружной Выбарчай Камісіі абвяшчае асабісты склад Камісіі ў ваяводзкім „Dzienniku Urzędowym“. Акружная Выбарчая Камісія абвяшчае ўва ўсіх валасьцёх дзень выбараў, гадзіны галасаваньня, лік паслоў, каторыя маюць быць выбранымі з акругі і час, спосаб і апошні тэрмін падаваньня кандыдатаў і дэкларацыяў аб прылучэньні акружнага сьпіску да дзяржаўнага сьпіску, а так-жа аб асабістым складзе і ўрадавым памешканьні.

20 сьнежня. Валасная Рада і сабраньне солтысаў, ці Камісар Ураду, ці павятовы аддзел назначае ці вызначае 3 сяброў абвадовай выбарчай камісіі і гэтулькі ж іх заступнікаў.

25 сьнежня. Начальнік воласьцяў (прэзыдэнты, бурмістры, войты, кіраўнікі дамініальных абшараў) робяць для кожнае меншасьці сьпісак выбаршчыктў у 3 экзэмплярах.

Павадыр Акружной Выбарчай Камісіі паведамляе начальніка воласьці і падае аб гэтым да публічнага ведама.

27 сьнежня. Начальнік воласьці перасылае 3 экзэмпляры сьпіску выбаршчыкаў павадыру Абвадовай Выбарчай Камісіі.

1 студзеня. Абвадовая Выбарчая Камісія перасылае 1 экзэмпляр сьпіску выбаршчыкаў Акружной Выбарчай Камісіі.

2 студзеня. Абвадовая Выбарчая Камісія выстаўляе сьпіскі выбаршчыкаў для публічнага агляду.

15 студзеня. Апошні дзень выстаўленьня сьпіскаў выбаршчыкаў для перагляду.

16 студзеня. Апошні тэрмін падаваньня рэклямацыяў у Абвадовую Выбарчую Камісію проціў няўпісаньня каго колечы ў сьпісак, ці якое не будзь незаконнае запісі.

22 студзеня. Апошні тэрмін падаваньня спраціву рэклямацыяў проціў вычырківаньня са сьпіскаў.

24 студзеня. Падаваньне дзяржаўных сьпіскаў кандыдатаў.

27 студзеня. Абвадовыя Выбарчыя Камісіі перасылаюць Акружной Выбарчай Камісіі 2 экзэмпляры сьпіскаў выбаршчыкаў.

30 студзеня. Абвадовыя Акружныя Камісіі прымаюць спрацівы проціў вычырківаньня са сьпіску выбаршчыкаў і дабавачна перасылаюць іх у Акружную Выбар. Камісію.

1 лютага. Кандыдаты з дзяржаўных сьпіскаў падаюць Павадыру Дзяржаўнай Выбарчай Камісіі дэкларацыі аб сваей згодзе на пасольскі мандат.

3 лютага. Генаральная Выбарчая Камісія абвяшчае ў „Monitorze Polskim“ дзяржаўныя сьпіскі кандыдатаў і падаваньне акружных сьпіскаў кандыдатаў.

5 лютага. Акружныя Выбарчыя Камісіі перасылаюць Абвадовым Выбарчым Камісіям 2 экзэмпляры аканчальна зацьверджаных сьпіскаў выбаршчыкаў, адначасна 3 экзэмпляры перасылаюць да начальнікаў воласьцяў.

9 лютага. Павадыры Абвадовых Выбарчых Камісіяў выстаўляюць аканчальна зацьверджаны сьпісак выбаршчыкаў для публічнага агляду.

11 лютага. Кандыдаты з акружных сьпіскаў падаюць Павадыром Акружных Выбарчых Камісіяў дэклярацыю аб сваей згодзе кандыдаваньня. Паўнамоцнікі акружных сьпіскаў кандыдатаў падаюць Павадыру Акружной Выбарчай Камісіі дэклярацыю аб прылучэньні акружнога сьпіску да сьпіску дзяржаўнага.

13 лютага. Апошні дзень выстаўленьня сьпіскаў для публічнага агляду аканчальна зацьверджанага сьпіску выбаршчыкаў.

21 лютага. Акружныя Выбарчыя Камісіі дастаўляюць Абвадовым Выбарчым Камісіям афішы са сьпіскамі кандыдатаў у мэтах публікацыі.

4 сакавіка. Галасаваньне ў Сойм.

7 сакавіка. Паседжаньне Акружной Выбарчай Камісіі для ўстанаўленьня вынікаў выбару ў Сойм.

11 сакавіка. Галасаваньне ў Сэнат.

14 сакавіка. Паседжаньне Акружвой Выбарчай Камісіі для ўстанаўленьня вынікаў выбару ў Сэнат.

Пілсудскі паехаў у Жэнэву.

7. XII. 27 г. марш. Пілсудскі выехаў у Жэнэву.

Далейшы развал Пяста.

5 павятовых арганізацыі Пяста ў Львоўскім ваяводзтве перайшло на бок сэн. Буйкі а ўласьне Жулкеўскі, Рава Руская, Сокаль, Мосьціска, Гарадок Ягелёнскі. У бліжэйшых днях да гэтага маюць далучыцца яшчэ некалькі паветаў, так што ўплыў Вітаса ў Усходняй Галіцыі зьбліжаецца да поўнай ліквідацыі.

Кандыдатура Тромпчынскага.

Прэса паведамляе, што на першае мейсца ў Пазнаньшчыне па эндэцкаму сьпіску высоўваецца кандыдатура Трампчынскага—былога старшыні сэнату.

Польскія купцы і надыходзячыя выбары.

Зьезд Галоўнай Рады Саюзаў Польскіх Купцоў прыняў наступную вельмі характэрную рэзалюцыю, якую зьмяшчаем у скарочаньні. Рэзалюцыя сцьвярджае фінансавыя дасягненьні ўраду і дамагаецца зьмены канстытуцыі ў кірунку павялічэньня праў прэзыдэнта і ўлады ўраду, зраўнаньня праў Сойму і Сэнату і запэўненьня пераважнага і беспасрэднага ўдзелу прафэсыянальных груп (чытай дэлегатаў купцоў, фабрыкантаў, абшарнікаў і інш. капіталістаў). Галоўная Рада выказывае перакананьне, што працы ў вышэй азначаным кірунку павінны быць галоўным, калі ня выключным, заданьнем будучага Сойму.

Гэтак дзеецца з канстытуцыяй і дэмакратыяй, калі паны капіталісты чуюць сябе ня пэўна ў сядле.

Цэнтральны Каміт. ППС — у справе польска-літоўскага канфлікту.

Ц. К. ППС — у зьвязку з апошнімі падзеямі ў справе польска-літоўскага канфлікту—прыняў рэзалюцыю, у якой, выражаючы сымпатыю да барацьбы літоўскай дэмакратыі проці ўраду Вальдэмараса, аднак-жа — пакідае гэтую барацьбу выключна сілам літоўскай дэмакратыі, адкідаючы катэгарычна ўсялякую магчымасьць вырашэньня гэтага спору Польшчы з Літвой аружным шляхам, а таксама спробы якога-небудзь умяшацельства Польшчы ў ва унутраныя справы Літвы. ППС востра кляйміць усялякую ваенную агітацыю ў Польшчы з боку „безадказных групкаў — з Крэсавымі абшарнікамі на чале“, якія гатовы заўсёды кінуць у небясьпеку ўвесь край —дзеля сваіх клясавых інтэрэсаў—здабыцьця назад сваіх маёнткаў, што асталіся на той бок граніцы...

М. Т—к.

Я зразумела, адчула...

I.

Ноч. Паветра ціхае, цёплае; неба ўзіраецца тысячай зор.

Цішыня... Толькі час-ад-часу па вёсках пранясецца голас сабачага брэху, які хутка сьціхае, як-бы баючыся зрушыць гэтую прыемную, прыгожую начную ціш. Дрэвы стаяць моўчкі, быццам адпачываюць.

Па дарозе да вёскі Лявонавіч йшла пара чалавек: мужчына і жанчына. Лёгкая паходка, звонкія галасы так і казалі, што гэта моладзь. І не памыліліся-б: Зоська—маладая дзяўчына, вярталася дамоў; яе праводзіў Міхась—хлапец з суседняга мястэчка.

— Ведаеш, Зоська, а сягоняшняя рэпэтыцыя куды лепш ішла, як прошлая!

— Але. Зусім добра. Я думала, што з нас такі нічога ня будзе, але сёньня паказала, што можна працаваць!

— Нічога! Пачатак заўсёды цяжкі.

— Але і сьмешная роля Пранціся! Ха-ха-ха! Завядзі, кажа, яшчэ сваю шарманку! Ха-ха-ха!

— Ага.

— Усё-ж, Якім мне лепш падабаецца!

— Ведама! Каму ён не спадабаецца?! Гэта, брат, чалавек, які знайшоў дарогу, які за нешта змагаецца!

— Ты ізноў—змагаецца! Надаеў ты мне з сваім змаганьнем! Кожны дзень трубіш.

— Але-ж, такі мы будзем з табою змагацца.

— Ну, ведама! Я дык першая за табою ў рады!

— Ці праўда? Дай за гэта руку! Шчыра дзякую табе. — І ён так моцна сьціснуў, што Зося ажно скрывіла губкі і пачырванела.

— Досыць табе ўжо ціснуць!

— Ведаеш, Зоська, ты толькі адна мяне зразумела!

— І ты мяне зразумеў!

— Але вось і твой ўжо дом. Вось хутка прыйшлі! Мне нічуць ня здоўжылася.

— І мне таксама. Ну, бывай здароў!

— Бывай! Але глядзі заўтра прыйдзі!

— Аб гэтым ты не бядуй!

— Бывай!

— Бывай!

Сьціснуўшы моцна рукі, яны разыйшліся. Міхась радасны, поўны надзеі, пайшоў назад у мястэчка, Зоська зайшла ў хату.

Тут ужо ўсе спалі. Яна ціха, як кошачка, дабралася да свайго ложка, разабралася і заснула, як камень.

II.

Дзень, гэты гарачы жніўнёвы дзень, пачынаў ужо прабуджацца. Жаўранак даўно ўжо яго чакаў, пяючы сваю песьню недзе высока, высока ў нябесным прасторы. За ім пачалі падаваць галасы іншыя птушкі.

Зара разгаралася. Яе чырвань спатыкала мэлёдыя птушыных галасоў у полі, яе спатыкала працоўная вёска. Усё жыло, захоплівала на поўны рот, тую жыцьцёвую сілу, якую нясла раніца—крыніца ўсяго, што хоча жыць.

Марыля—маці Зосі—даўно ўжо ўстала і збудзіла мужыка, які зараз-жа паехаў на сенажаць; сама-ж падаіла каровы і выправіла на пашу. Яна ведала, што яе дачка позна прыйшла, што недзе там бадзялася на рэпэтыцыях, якія ніякай, па яе думцы, карысьці ня прыносяць і, хоць злавалася, аднак казала сабе: „Няхай пасьпіць, адпачне!“ Але калі ўжо сонца пачало заглядаць сваімі залатымі праменьмі ў хату і трэба было ісьці жаць, пачала будзіць Зоську.

— Уставай! Чуеш?—гукала яна,—„Напрацавалася жартачкі? Сонца ўжо ўзышло.

Зоська схапілася. Працёрла свае мілыя вочкі. На прыгожым твары ня было сьледу зморыньня, ён так і сьвяціўся моладасьцю, жыцьцём.

— І што ты маеш з гэтых ціятраў? Чаго гэта, каб цябе запытацца, кожную ноч бадзяешся? Чорт цябе ведае?

— Ужо кожную ноч!—буркнула пад нос Зоська.

— Ну, ведама! Каб гэта ўзяў калі дзеркача ды высьвеньціў тваю дурную галавешку, ведала-б як хадзіць. Пытаюся цябе, што табе дасьць гэтая, як ты кажаш, рапатыцыя? Можа чаравікі купіць, сукенку набярэ!

— Не хачу я нічога, толькі адчапецеся?

— А, што ты голая будзеш хадзіць? Чакай! Падаткну табе я нос. Глядзі, каб ты ўжо ад гэтага дня кінула, бо іначай я табе галаву пахвашчу! Чуеш, ты, непаслушніца?

— Чую, чую!...

— Глядзі! — і сказаўшы гэта, маці выйшла.

„І што мне рабіць? Вось кожны дзень так рэжа, пілуе. Хоць плач! Але што гэтым паможаш? Не! Трэба з гэтым скончыць. Сягоньня скажу Міхасю, што больш не магу. Як заплацяць... і аж сама спалохалася таго, што падумала.

— Ну ідзі еш ды пойдзем жаць!

Цераз некалькі хвілін яны ўжо з сярпамі ішлі дарогаю да свайго жыта. Прыгожасьць прыроды, сьвежае паветра агарнула Зоську і яна забылася, пакінула свой пэсымізм. „Чаму-ж мне ня пець? Чаму-ж ня гудзець?“ вырвалася з грудзей, нясучы з сабой радасьць і задавальненьне.

III.

Хоць маці сьцерагла, але Зоська такі ўвечары вырвалася і пабегла. Сьпяшалася, бо ўжо надыходзіла ноч. Калі прыбегла на месца, то пабачыла, што спазьнілася крыху і яе ўсе чакалі.

— Чаму-ж гэта так позна? — пытаўся, вітаючыся, Міхась.

— Ат, ледзьве і так прыйшла!

— Што-ж такое?

— Пасьля раскажу!—і зараз падумала: „Што я зраблю? Трэба расказаць і пакончыць з гэтым. Што-ж, калі заплацяць, то“... і недакончыла.

Сорамна зрабілася, калі пабачыла твары з зусім іншымі думкамі.

Рэпэтыцыя прайшла надта добра. Усе былі вясёлыя і рагаталі на ўвесь рот. А поўначы пачалі разыходзіцца. Міхась ізноў праважаў Зоську. Цяпер, аднак, як ні хацеў яе развесяліць, нічога не памагло. Яна думала, як гэта расказаць сваю бяду, але так, каб было добра, каб не засароміць сябе.

— Чаго ты такая сумная?

— Ат, працуй, працуй і ўсё надарма!

— Якта на дарма? Што ты, Зоська, кажаш?

— Ну, якую карысьць я маю?

— Як? Ці цябе не здавальняе тое, што

* * *

пасьвячаю В. Л....

Сумна ў вастрозе, наўкол усе сьпіць...
Думка за думкай імкнецца
На волю, якая за кратай ляжыць,
Жыцьцё дзе крыніцаю бьецца.

Да быстрага Нёмна, што грозна гудзе,
Да зорак, што ў небе мігаюць,
Да родных братоў, якія ў бядзе
Лёс цяжкі жыцьця праклінаюць.

. . . .
. . . .

І доўга ня сьпіцца, ўсё думкі лятуць
Туды, дзе працуюць у згодзе,
Дзе птушкі шчабечуць і песьні пяюць
Аб роўнасьці, волі, свабодзе.

Горадня—вастрог. **Молат.**

Далоў маску!

Пад гэтым загалоўкам атрымала рэдакцыя наступную карэспандэнцыю — артыкул, якую ніжэй з падзякай зьмяшчае.

У № 5-м газэты „Праца" быў зьмешчаны артыкул „Паўлюкевіч працуе", у якім пісалі аб г. зв. „зьезьдзе радных", скліканым панам Паўлюкевічам у пачатку мінулага месяца ў Вільні. „Зьезд" гэты, як ужо пісалася, быў самазванскі, бо ані сам Паўлюкевіч, ані ніхто з яго шайкі не зьяўляюцца раднымі і з самаўрадамі ніякага дачыненьня ня маюць. На „зьезьдзе" была толькі невялічкая група праўдзівых радных, якіх Паўлюкевічу ўдалося рознымі ашуканскімі штучкамі ўцягнуць на свой „зьезд" і выкарыстаць іх пасьля дзеля сваей палітычнай кар'еры, а рэшта былі купленыя за грошы „малайцы"—розныя балахоўцы, аляксюкоўцы, дзергачоўцы і падобныя ім.

Раскрыўшы вочы беларускага сялянства на тыя махлярствы і ашуканствы, якімі паслугоўваецца Паўлюкевіч у сваей афёрнай працы, газэта заклікае тых грамадзян радных, якія палі ахвярай ашуканства п. Паўлюкевіча, змыць з сябе тую пляму, якую налажыў на іх Паўлюкевіч,—парваць з ім усялякую сувязь і голасна заявіць аб гэтым у прэсе.

На водгук доўга чакаць ня прыйшлося. Зараз-жа пасыпаліся ў рэдакцыі лісты ад ашуканых радных, у якіх яны адхрышчваліся ад Паўлюкевіча, як чорт ад крыжа і кляймілі ганьбай яго здрадную працу.

А цяпер жа атрымана вестка, што ў нядзелю 27-га лістапада с. г. адбыўся ў м. Баранавічах першы беларускі зьезд радных Баранавіцкага павету, на якім, апрача рэзалюцыяў сацыяльнага, гаспадарчага і асьветнага зьместу, аднагалосна прынята рэзалюцыя — пратэст проціў Паўлюкевічавага зьезду, як зьезду самазванскага, не выяўляючага волі радных усей Заходняй Беларусі, а толькі кучкі палітычных махляроў і прайдзісьветаў. У рэзалюцыі гэтай паміж іншым гаворыцца: ...„Што пан Паўлюкевіч, перахапіў чужую ініцыятыву, шляхам самазванства, бо не належыць да самаўрадаў. Скліканы ў Вільні 6—7 лістапада с. г. псэўда самаўрадавы (палітычны) „зьезд радных Заходняй Беларусі", зрабіў усільне таму, каб перашкодзіць адбыцьцю ў будучыне праўдзівых зьездаў, ці агульнага зьезду радных беларусаў дзеля падняцьця культуры і дабрабыту краю".

„Што паклікаючы на „зьезд" радных", пускаў у рады самаўрадаўцаў, нягодныя ашуканствы і махлярствы, абяцаючы галаваломныя канцэсіі як бы з неба і г. д., каб прышчапіць радным шкурніцтва, фальш і маральнае гнільлё".

„Што пан Паўлюкевіч зьяўляецца наагул шкадлівай асобай для падняцьця самаўрадаў на адпаведную вышыню. Першы агульны зьезд самаўрадаўцаў беларусаў Баранавіцкага павету пастанаўляе: выразіць пану Паўлюкевічу сваю пагарду, а адбыты ім „зьезд" лічыць не правамоцным, а толькі так званым—паўлюкевічавым".

Спадзяемся, што за прыкладам Баранавіцкага павету пойдуць і іншыя паветы і ўсе ў адзін голас выразяць сваю пагарду п. Паўлюкевічу і ўсей ягонай бандзе.

Сяляне! Усе гатуюцца да выбараў. За юдавы грошы разсылае Паўлюкевіч да вас сваіх агентаў, якія ў большых мястэчках і вёсках закладаюць нейкія „сэкрэтарыяты Белар. Нацыянальнай Рады" і „выбарчыя камітэты", Гэта пасткі для Вас, сяляне! За дарма дадзеную „юрыдычную" параду, або за дарма напісанае паданьне хочаць купіць вашыя галасы пры выбарах да Сойму, каб пасьля, у працягу пяцёх гадоў, езьдзіць па вашых сьпінах.

Сяляне, не зацягвайце сваімі рукамі пятлю на сваю шыю! Сьвядомыя сяляне павінны перасьцерагаць несьвядомых, каб ніводная сялянская нага не пераступіла парогу гэтых „сэкрэтарыятаў" і „камітэтаў", каб ніводзін паўлюкевічаў агент не знайшоў прыстанішча ў вашай працоўнай хаце — хай зямля беларуская будзе для іх афрыканскай пустыняй.

Дык далоў маску, пане Паўлюкевіч. Рукі прэч ад беларускага сялянства! Места табе сярод манархістых. Голас твайго выхаванка і вучня — Барыса Кавэрды заве цябе да сябе... **Янка Гаротны.**

Заграніцай.

XV кангрэс камуністычнай партыі ў Маскве.

У Маскве распачаўся XV кангрэс камуністычнай партыі СССР. У кангрэсе прымае ўчасьце — 887 сяброў з рашаючым голасам 725. Кангрэс адчынены Рыкавым; пасьля яго прывітальнай прамовы выбраны прэзыдыум— з 52 асобаў.—У склад прэзыдыуму ўвайшлі найвыдатнейшыя павадыры ўрадавага напрамку і аніводнага — з апазіцыі. Для разгляду справы апазіцыі выбрана камісія ў складзе 65 асобаў. У склад гэтай камісіі таксама не ўвайшлі прадстаўнікі апазіцыі (так даносяць ,тутэйшыя газэты), проці чаго апазіцыя на кангрэсе заявіла пратэст.

Другі дзень кангрэсу быў ахвяраваны дакладу аб палітычным палажэньні СССР, які ад імя Ц. К. зрабіў Сталін. Даклад цягнуўся 7 гадзін. У першай частцы Сталін разглядзеў замежную палітыку СССР, у другой—унутран. палітычную працу ўраду, у трэцяй—унутранае жыцьцё партыі. У канцы Сталін патрэбаваў ад апазіцыі — поўнай ліквідацыі яе ідэолёгічнай і арганізацыйнай.

Чаму Францыя пасьпяшыла з падпісаньнем трактату з Югаславіяй.

Цікаўныя рэвэляцыі робіць француская прэса—у справе трактату „ваеннай прыязьні" з Югаславіяй, скіраванага проці засільля Італіі на Балканах. Аказываецца, як піша крайне-левая газэта „Чалавечнасьць", што францускі ўрад, які даўгі час зусім не сьпяшыў падпісываць трактат з Югаславіяй, спадзяючыся (наіўна...), быццам да яго далучыць свой падпіс і Італія, гэткай „дэманстрацыяй" цягнуў бы справу і надалей,—не жадаючы гневаць Італіі, аднак-жа—і не баючыся ўплыву яе аднэй на Балканах... Прыняў-жа рашучую пастанову францускі ўрад толькі тады, калі пабачыў, што да італьянскай акцыі на Балканах — скіраванай проці францускага ўплыву—далучылася і Англія...

Калі ж у Белград прыехаў дырэктар англійскага банку п. Клярк, дый распачаў перагаворы з югаслаўскім урадам у справе англійскай пазыкі, тады Францыя добра зразумела ўсю небясьпеку для сваіх уплываў у Югаславіі...—„Вялікшы прыплыў англійскіх капіталаў у край, піша газэта, лёгка-б здолеў перацягнуць Югаславію на бок англа-італьянскага палітычнага лягеру"...

Тады Францыя перастала адразу хістацца і—адкрыла карты сваей палітыкі на Балканах...

Гэтыя рэвэляцыі яшчэ раз сцьвярджаюць англа-італьянскую хэўру на Балканах, дзе Італія зьяўляецца — яўным падпалячам, а „пацыфічная" Англія—таксама...

Наша хроніка.

З жыцьця беларускіх арганізацыяў. Заснавалася новае дабрадзейнае Т-ва пад назовай „Беларускае Дабрадзейнае Таварыства", статут, якога нядаўна зацьверджаны Міністэрствам Унутраных Спраў. У новае Т-ва ўступіла шмат ужо сяброў. Першы арганізацыйны сход адбыўся 4-га сьнежня, на якім быў абраны ўрад і рэвізыйная камісія ў такім складзе:

1. Шырма Рыгор—старшыня, 2. Савіцкі Іван — віцэ старшыня, 3. Пяткевіч Міхал — віцэ старшыня, 4. Шнаркевіч Язэп—скарбнік, 5. Лукашэвіч Уладзімер—сэкрэтар. У склад рэвізыйнае камісіі ўвайшлі: 1. Манцэвіч Мікалай—старшыня, 2. Вітт Іоган—сябра, 3. Павалковіч Уладзімер—сябра.

Новазаснаванае Т-ва ставіць сабе вельмі шырокія мэты ў рамках дабрадзейнасьці.

Агульны сход Беларускага Т-ва Помачы пацярпеўшым ад вайны адбыўся ў аўторак 6-га г. м. На парадку дня стаялі справаздача старога ўраду і выбары новага ўраду і рэвізыйнае камісіі.

У склад новага ўраду былі абраны:

1. Савіцкі Іван—старшыня, 2. Марцінчык Мікалай—віцэ старшыня, 3. Шнаркевіч Язэп—віцэ-старшыня, 4. Пяткевіч Міхал — скарбнік, 5. Шырма Рыгор—сэкрэтар, 6. Лукашэвіч, Уладзімер—сэкрэтар, 7. Астроўская Антаніна—сябра, 8. Паўловіч Сяргей—сябра, 9. Сіняўскі Мікалай—сябра. У склад рэвізыйнае камісіі ўвайшлі:

1. Кэпель Мітрафан—старшыня, 2. Манцэвіч Мікалай—сэкрэтар, 3. Манкевіч Уладзімер—сябра.

Вучнёўскі Суботнік у Віленскай Беларускай Гімназіі. У суботу 10 сьнежня адбудзецца вучнёўскі Суботнік у салі Віленскае Беларускае Гімназіі. Пастаўлена будзе: „На парозе справы"—камэдыя ў 3-х актах Астроўскага, пераложаная Верай Грыц. У антрактах будзе граць духовы аркестр вучняў гімназіі. Уваход выключна па запросінах, якія можна атрымаць у Марыі Скурко. Пачатак Суботніка а 7 гадз. вечара.

„Ня мілуюць". У першай палавіне лістапада с. г. атрымалі ўсе абвінавачваныя з Ваўкавыскага палітычнага працэсу „Трынаццацёх", якіх вінавацілі ў прыналежнасьці да камуністычнай партыі, выракі. Суд быў 27-28 кастрычніка. Бараніла 3-х адвакатаў. Асуд наступны: І. Агульніку, Грунасу А., Лавіку М., Раманчуку М., Герману В. па 4 гады цяжкай турмы. Марчуку М. і Гарбару А. па 2 гады дома паправы, а Стасевічу А. 1 год дома паправы, Бязносіка У., Сегена У., Шварца К., Шыркоўца Т. і Сявошку А. — унявінілі. Першым 5 і Марчуку залічана па 11 месяцаў. З усяго гэтага характэрна толькі тое, што Стасевіч зьяўляўся даноўшчыкам і павінны былі-б яго звольніць, аднак-жа гэтага не зрабілі, а далі дому паправы, каб ляпей відаць даносіў, бо цяпер, відаць, кепска справіўся.

Значыць, прышлі кепскія часы і на даноўшчыкаў, калі і іх ня мілуюць.

Зьмена паштовага тарыфу. З дня 1-га сьнежня зьменены тарыф ў паштовым звароце. У тэлеграфічным аддзеле зьмена адбудзецца толькі з 1-га студзеня 28 г., а паштовы тарыф зьменены ўжо. Цяпер звычайны краёвы ліст будзе каштаваць 25 грошаў, заказны і заграмічны 65 гр., паштоўка 15 гр.

Ахвяры. Атрымана на карысьць ахвярам стыхійных няшчасьцяў з в. Навасёлкі Горадзенскага пав. 77 зл. і ад вёскі Загорцы таго самага пав. 37 зл.

Камітэт Помачы Ахвярам стыхійных няшчасьцяў усім ахвярадаўцам складае шчырую падзяку.

Атрымана на карысьць Т-ва Беларускае Школы ад:

1) Дзісьненскай Акружнай Управы Т. Б. Ш. (у Глыбокім) 10 зл.
2) Пузавіцкага гуртка Горадзенскага пав. 15 зл.
3) Грам. Назарука Піліпа 10 зл.
4) Вёскі Магіляны Горад. пав. 4 зл.
5) Гуртка ў Вялікай Кракотцы Слонімскага пав. 59 зл.
6) Грам. Смыка Янкі (цераз „Саху") 4 зл.
7) Артыстаў-аматараў у Дзятлычы Слонімскага пав. 10 зл.

Разам усяго 112 зл.

Усім ахвярадаўцам Галоўная Управа Т-ва Б. Ш. прыносіць шчырую падзяку і шле сяброўскае прывітаньне.

З Т-ва Бел. Школы.

Праца гурткоў Т-ва Беларускае Школы.

Мала-Галіцкі гурток, Слонімскага павету ў школьным будынку в. Сасноўцы 6-га лістапада наладзіў спэктакль-вечарыну. Сыграны былі п'есы: „Апошняе спатканьне"—драма Ул. Галубка і „Лекары і Лекі" — камэдыя А. Гаротнага. Саля была перапоўнена глядзельнікамі.

Дружнымі воплескамі і крыкам: „Хай жыве беларуская культура і беларусы!"—спэктакль закончыўся.

Увесь даход ад спэктаклю (роўна як і ад папярэдніх) пайшоў на выпіску кніг для бібліятэкі чытальні пры гуртку. У пастаноўцы спэктаклю нашы слаўныя дзяўчаткі, ня толькі самі ахвотна працавалі, але і іншых хлапцоў заахвочвалі, служачы адначасна ім прыкладам. Чэсьць вам, будучыя гаспадынькі!

Гарадоцкі гурток, Беластоцкага пав. наладзіў спэктакль вечарыну ў м-ку Міхалове 6 лістапада. Сыгралі „Апошняе спатканьне". Даход пайшоў на закупку розных прыладаў для гуртка.

27 лістапада маецца ставіцца на сцэне ў Гарадку драма „Страхі жыцьця" і камэдыя „Зьбянтэжаны Саўка".

У Гарадку за час існаваньня гуртка наладжваецца 4-ая вечарына.

Міжавіцкі гурток, Слонімскага пав. ў в. Міжавічы сыграў 1 кастрычніка с. г. „Суд"— камэдыя Галубка і „Лекары і Лекі" — камэдыя Гаротнага.

Чысты даход ад спэктаклю пайшоў на карысьць бібліятэкі-чытальні імені Якуба Коласа пры гуртку. Гурток заклікае ўсю беларускую моладзь, у якой б'ецца роднае беларускае сэрца, хутчэй узяцца за працу.

Глыбоцкая Акружная Управа. Тэатральная сэкцыя 6 лістапада выехала ў м-ка Докшыцы, дзе сыграла: „Янка Канцавы" і „Лекары і Лекі". Апроч п'есаў, добра прайшлі дэклямацыі: „Ворагам беларушчыны", „Ужо днее" і інш., гапак і скокі.

Глядзельнікаў было 75 асобаў. Спэктакль даў дэфіцыт. Гульнёй і дэклямацыямі асталіся ўсе задаволены. Задаволенымі асталіся і артысты-аматары, якія парашылі дэфіцыт пакрыць з свайго кішэня.

ты маеш? што пераживаеш? Ці ляпей было-б табе сядзець тут у курнай хаце, далёка ад гэтага сапраўднага жыцьця?

— Ты не разумееш! Ты не разумееш, ня ведаеш, што ў мяне ў хаце робіцца! Што мае бацькі кажуць? Табе добра, калі цябе ня грызуць!

— Слухай, Зоська!

— Што тут слухаць!

— Ну, нічога! Я цябе толькі прашу, памажы нам гэты раз паставіць. Добра? Гэта-ж заўтра нядзеля і заўтра-ж будзем ставіць.

— Калі ўзялася, то трэба скончыць!

— Зоська! Не спадзяваўся ніколі гэтага ад цябе. Але нічога ўсё пераможам! Ці ня праўда?

— Можа і праўда.

— Ня сумуй! Бывай здарова!

IV.

Каля Міхасёвага гумна кіпела работа. Насілі дошкі, секлі, пілавалі, а ўсё на тое, каб збудаваць сцэну. Праца йшла весела, спорна. Цэлыя грамады цікавых прыходзілі, каб паглядзець „як гэта ў хляве будуць гуляць"?

Пад вечар усе работы былі скончаны. Гумно было, толькі звонку гумно, у сярэдзіне-ж гэта была прыгожая саля. Рады лавак, як-бы чакалі гасьцей. Столь уся была ў зелені: маладыя бярозкі паспускалі свае лісткі, напаўняючы паветра прыемным пахам. У адным канцы была сцэна. Яна прадстаўляла сабою вясковую хату, патрэбную якраз для „Паўлінкі".

Пачынала цямнець, калі пачалі тлумна прыходзіць людзі. Валілі і валілі. Усе: старыя і маладыя. У хуткім часе ўсе мейсцы былі занятыя.

Артысты весела прыгатаўляліся. Твары гарэлі агнём, ўва-ўсіх моцна білася сэрца.

— Тук, тук, тук!... — мусіць наймацней у Зоські.

— Хутчэй, хутчэй хлопцы! — падганялі адзін другога.

За заслонай данасілася гудзеньне сабраўшыхся сялян.

Нашыя „артысты" ўздымаліся, расьлі; дрож радасьці, шчасьця прабягала па целе.

Пачатак...

Адхіляецца заслона. Захопленьне. Адкрытыя вочы і — „ах"! — ува-ўсіх вуснах. Дзіўная радасьць ўва ўсіх. Нашае жыцьцё, як на далоні. Кожны глядзельнік нібы адарваўся, нібы падняўся недзе далёка — далёка ўверх і адтуль глянуў. Глянуў і пабачыў на тое, дзе калісь быў, дзе жыў. Пабачыў сваё жыцьцё.

Канец. Заслона закрываецца. Бура воплескаў, страшэнны гул. „Паўлінка! Паўлінка"!

На сцэне-ж Зоська бегала і шукала Міхася.

— Чаго? — той адазваўся.

— Ведаеш, я зразумела, я адчула! Я хачу жыць, я хачу змагацца! Хачу будаваць новае жыцьцё вось для тых! — і паказала ў бок працоўнай масы.

Міхась сьціснуў руку.

— І я з табою і яны з намі!

КАРЭСПАНДЭНЦЫ.

Чэсьць і слава!

(З Косаўшчыны).

Не магу ўстрымацца, каб не зьмясьціць на шпальтах нашае газэты ўсяго таго, што мне прышлося пабачыць. У нядзелю 20 лістапада с. г. я выпадкова папаў у в. Галік, аж чую там разгаворы, што сёньня тут адбудзецца белар. спэктакль-вечарына, ладжаны агульнымі сіламі вясковай моладзі, пад кіраўніцтвам гуртка Т-ва Белар. школы, (уход, канешна, за плату). Думаў ісьці дамоў, але парашыў застацца. Тут я першы раз пачуў на сцэне роднае мне слоўца і быў вельмі задаволены, што першы раз ставяць, а так добра выходзе. Гралі: твор „Дрыгва" і камэдыю „Зьбянтэжаны Саўка". Вечар прайшоў вельмі карысна і прыемна, а дзеля гэтага, лічу сваім абавязкам сказаць: Чэсьць і слава Вам—сейбітам свайго роднага слова! Няхай ваш паступак збудзіць тыя гушчы, што яшчэ дагэтуль сьпяць. А Вы, маладыя артысты, артысткі-аматары і ўся моладзь в. Галіка, на вашых тварах гараць яскравыя доказы таго, што Вы здольны весьці культ.-асьветную працу, як найлепей, а дзеля гэтага: больш энэргіі! Больш працы!

Няхай б'юць праменьні сонца і ў наша— Беларускае ваконца! **Пералётны.**

Каму жаліцца.

У ноч з 1-га на 2-ое кастрычніка с. г. у в. Хаценчыцы былі параклейваны проціпанствовыя адозвы. Дзеля таго, што адозвы былі прыклеены ў тым месцы, дзе дзяжурыла паліцыя і навет, як кажуць, на дзьвярох пастарунку, дык паліцыя стала „на дыбы". Пашлі вобыскі, ў выніку якіх арыштавалі двох, у тым ліку і майго 17-ці гадовага сына Аляксандра Сташкевіча. Падставай арышту паслужылі плюскаўкі (кнопкі), якія былі знойдзены ў мяне і якія аказаліся падобнымі да тых, што былі прыбіты адозвы.

Ня гледзячы на тое, што я ўдаводніла, што сын мой у тую ноч з 1-га на 2-ое кастрычніка быў на начлезе і нікуды не адлучаўся, а кнопкі ў мяне, як уласьніцы склепу, могуць быць розныя, справе сына не памагло.

„Арыштанты" сядзяць і гінуць у Вялейскім вастрозе, куды ня пускаюць навет бацькоў пабачыцца з „найвялікшымі праступнікамі", абвінавачваць якіх у гэтым праступку ёсьць менш падставы, чым тых, хто іх абвінавачвае.

Пісала да сьледаваацеля, пракурора, але-ж ці ім галава баліць, што гінуць нявінныя людзі.

Каму жаліцца?—Вам, паважаныя чытачы, бо вы лепш усіх сытых адчуеце гора мацярынскага сэрца.

Ольга Сташкевіч.

„Шчасьлівы"!

(З Баранавіцкага пав.).

У „Працы" ужо пісалася аб сэнатары Назарэўскім, што ён з Паўлюкевічам. Гэта ўсім даўно ведама. Але, „Сялянская Ніва" выракаецца яго, свайго старага прыяцеля і сябры, і гэта няпраўда. Назарэўскі заўсёды граў двайную ролю, біў на два фронты, а то навет і на тры. Беларусам ён ня ёсьць. Будучы радным магістрату, ён настаяў, каб магістрацкая фракцыя рады называлася „праваслаўнай", а не беларускай. Сыноў сваіх вучыць у польскім кадэцкім корпусе. Сястру выдаў замуж за асадніка з Галіцыі, ды яшчэ за старшыню асаднікаў, свайго прыяцеля. Госьці бываюць у яго толькі палякі, ды самыя беларусаеды, главары. А калі, дзякую-

чы дамаганьням мас быў звольнены староста-эндэк Квяцінскі, дык сэн. Назарэўскі са скуры вылазіў, езьдзіў да ваяводаў, каб таго аставіць у Баранавічах.

Аднак, ведама-ж, гэты сэнатар прайшоў па сьпіску № 16, але зараз жа на імя цесьця свайго атрымаў канцэсію на разьлеўню гарэлкі, што даецца не абы за што. Гэтым і тлумачыцца яго нялюбоў да грам. Луцкевіча і іншых, каторых упакавалі ў турму. Дык хай людзі ведаюць, хто ён такі, бо ён ужо цяпер прыйшоў у касу павятовую і патрэбаваў пазычку грошы, запэўняючы, што праз тры-месяцы ізноў будзе сэнатарам!

Б.

І асьветы не даюць.

(Горадзеншчына).

20 XI 1927 г. Палаткоўскі Гурток Т-ва Бел. Школы меўся наладзіць спэктакль-вечарыну ў вёсцы Палаткова. За пяць дзён была падана просьба да старасты ў Горадні аб дазволе пастаноўкі спэктаклю-вечарыны ў пустой хаце. Была падана п'еса ў 1 акце „Суд"—У Галубка і дэклямацыя вершаў. Пацешылі нас, што дазвол дадуць цераз паліцыю. Вялікая радасьць ахапіла ўсю ваколіцу, чакаючы гэтага дня, як нібы якога вялікага сьвята. Чулася сярод сялянства, што гэта захапленьне, гэта чаканьне перарабіла нашых сялян, нашу моладзь, якія толькі і жылі надзеяй убачыць сваё мясцовае нацыянальнае сьвята. Ня гледзячы на тое, што першы раз, нашы маладыя артысты стараліся з вялікай ахвотай вызубрыць п'есу, як найлепей, і прыгатавалі сцэну да адчыненьня спэктаклю. Але — дарэмныя былі нашы лятуценьні, дарэмныя радасьці: дазволу нам у апошні дзень не далі. Чаму? Ці-ж нам ўжо нявольна зрабіць няшкоднае маленькае сьвята. Ці-ж камусьці страшна, каб наш сярмяжнік заняўся асьветай? Ці-ж ляпей глядзець, як наша моладзь замест асьветнай працы, будзе займацца п'янствам ды бойкамі, якое здараляся ў нашай моладзі часта? Дык вось, якую мы маем асьвету.

Нездаволены.

Пісьмы у Рэдакцыю.

Справа рэдактарства „Нашае Долі".

Высока Паважаны Рэдактар!

У адным з апошніх нумароў „Беларускага Дня" № 34 рэдактар яго Ф. Умястоўскі піша, што ініцыятарам і рэдактарам „Нашае Долі быў ня хто іншы, як ён сам.

Памятаючы добра гэтыя часы, ніяк ня можам згадзіцца на гэтую заяву, якая абсалютна пярэчыць праўдзе.

Галоўным ініцыятарам выдаваньня беларускай газэты ў час рэвалюцыі—1905—1906 гадоў быў сьв. памяці Іван Луцкевіч. Рэдактары, якія падпісвалі газэту былі фікцыйнымі; газэту выдаваў калегіяльны кружок, зложаны: з братоў Луцкевічаў, Цёткі, Каганца, Янкі Окліча, Тукеркеса ды З. Вольскага.

Са слоў Ф. Умястоўскага выходзіць, што ён за справу „Нашае Долі" быў арыштаваны і навет сасланы. Дзіўная рэч: у друкаваных матар'ялах да гісторыі „Нашае Долі", узятых з царска-жандармскіх архіваў ды друкаваных ужо ў месячніку „Полымя", нічога аб рэдактарстве, арышце і ссылцы Ф. Умястоўскага не ўспамінаецца. З другога боку — польскія пэпэсы, старыя віленскія дзеячы, апавядаюць, што Ф. Умястоўскі належаў да партыі ППС, лічыў сябе заўсёды паляком і за партыйныя справы (польскія!) адцярпеў кару. З гэтых-то кругоў віленскіх ППС-аў і вышла пратэкцыя і грошы для Ф. Умястоўскага, каб выдаваў палёнофільскую газэту. Гэта было ўжо і раней у 1919 годзе, калі яму запрапанавалі выдаваньне палёнофільскай беларускай часопісі, якую ён разам з Аляхновічам пачаў выдаваць пад наз. „Беларускае Жыцьцё", у каторым сам не працаваў, а іграў толькі ролю „мэцэната".

У справе рэдактарства „Нашае Долі" мог-бы рашуча сказаць інж. Р. Земкевіч. Мае ён найбагацейшы гістарычны беларускі архіў, у каторы ўвайшла і частка архіву „Нашае Долі", переданая яму ў Варшаве Тукеркесам, калі той нелегальна пры помачы палітычных дзеячоў у Варшаве, перабіраўся заграніцу.

Выдаваньне і рэдактарства „Нашае Долі", якое толькі цяпер (?) прыпісвае сабе Ф. Умястоўскі ёсьць звычайным „самазванствам", каторае лёгка можа быць даказана дакумэнтамі ды пасьведчаньнямі людзей, якія ў той час прыймалі ўдзел у „Нашай Долі" і жывуць яшчэ „на няшчасьце для пана Ф. Умястоўскага".

Прыйміце запэўненьне маёй вялікай да Вас пашаны Саўка Барывой.

22-га лістапада
1927 г.

Ад Рэдакцыі. Рэдакцыя ахвотна зьмяшчае пісьмо грам. С. Барывоя, якое, падаючы фактычны матар'ял аб складзе Рэдакцыі першай рэвалюцыйнай беларускай часопісі ў Вільні „Нашай Долі" — раскрывае маску ілжы, якую цяперашні рэдактар польскапанскай газэты на беларускай мове „Беларускі Дзень" п. Умястоўскі надзяе на сябе, каб даказаць камусь, што ён нібы працуе для „беларускае справы", выстаўляючы сябе аж мучанікам за яе. Значыць — усё гэта хлусьня і п. Умястоўскі ўсьцяж зьяўляецца толькі спэкулянтам на справе беларускіх працоўных і ня толькі цяпер, а і ад самага пачатку свайе „дзеяльнасьці".

Паважаны Грамадзянін Рэдактар!

Ветліва прашу зьмясьціць у Вашай паважанай газэце наступнае:

У „Беларускім Слове" № 32 зьмешчана карэспандэнцыя пад загалоўкам „Ганьба перад Народам". Аўтар тут робіць мне закіды, што я на паседжаньні Сойміку ў Слоніме 29/VIII г. г. прапанаваў і разам з іншымі бараніў унёсак аб выплаце дыэтаў сябром Сойміку па VI катэгорыі і, правёўшы гэту думку, пакрыўдзіў грамадзян Слонімскага пав. новымі падаткамі. Адначасна выхваляюцца тыя сябры, якія згаджаліся працаваць бяз дыэт, „ганарова".

Лічу за абавязак прызнацца, што аб дыэтах пытаньне я падняў, але не дамагаўся VI катэгорыі, а толькі згаджаўся на тую норму, якая была вызначана сябрам папярэдняга сойміку. Мой ўнёсак падтрымалі 21 сябра—ўсё беднейшыя, апроч 7 абшарнікаў і іх наймітаў, якім хадзіла аб тое, каб якнебудзь пазбавіцца на паседжаньні сойміку не пажаданых для іх прадстаўнікоў-бедлякоў. Думаецца, што за 40 вёрст ехаць у Слонім, траціць 2 дні і ночы ў самую гарачую рабочую пару працоўнаму бедняку немагчыма. Дзеля гэтага я ня лічу за праступнае атрымліваць некалькі злотых за працу.

Цяпер цікава запытацца ў аўтара і супрацоўніка органу дэфэнзывы, чаму ён маўчаў 7 гадоў, калі яго аднадумцы ў папярэднім сойміку ня толькі атрымлівалі гэтыя дыэты, але „гарой" стаялі за панскую справу? А можа Вам шкада цёпленькіх пасадаў, скуль лягчэй было трымаць у ланцугох тую масу, якой вы цяпер прапануеце ганаровую службу? Кіньце, паночкі, хваліцца сваім гонарам, бо селянін даўна даў яму цану.

Сябра Сойміку **Мікола Аліховік**.

Залоцева, Слонімскага пав.

Паважаны Грамадзянін Рэдактар!

Ветліва прашу зьмясьціць у Вашай газэце наступнае:

Я, як радны Вялейскае гміны, атрымаў мандат ехаць на канфэрэнцыю Беларускіх радных, якая адбылася 6 — 7 кастрычніка. Праўда, я паехаў, бо тады лічыў, што гэты зьезд ёсьць зьездам запраўдных радных, але-ж вышла тут наадварот.

Як я ўбачыў, што я папаў не на зьезд Беларускіх радных, а на зьезд ашуканцаў і агентаў Паўлюкевіча, я пакінуў гэту шулерню. Ня буду пісаць шмат, бо ўсяго і ня чуў па прычыне браку сілы бачыць зьдзек прахвостаў над народнай справай.

Праўда, тут усяго хапала: гарэлкі, піва, закускі было ўдоваль, і гэта за наш крывавы мазоль, і для нашага ашуканства.

Добра падпіўшы разьлівалася песьня, „Ад веку мы спалі і нас разбудзілі, мы знаем, што трэба рабіць, што трэба свабоды, зямлі чалавеку, што трэба навуку здабыць". Я-ж пяяў; „што трэба зладзеяў пабіць" і гэта паўтаралася аж два разы; на трэйці раз адна асоба затрымаўшы мяне спыталася: Czy pan mnie zabije?

Відаць, што на зладзею шапка гарыць. Ашуканства яскрава вылезла наверх.

Калі на канфэрэнцыі гэтага дня (6 XI 1927 г.) радны места Вільні Кузьма Крук папрасіў слова, дык яго пазбавілі і не далі яму гаварыць. П. Паўлюкевіч на канфэрэнцыі сказаў, што Беларуская мова чутна па ўсім сьвеце, але прывітаньня п.п. ваяводам і маршалку Пілсудскаму паслалі ў польскай мове.

Дык-жа заклікаю вас усіх братоў радных, у кім пад шэрай сярмягай б'ецца чэснае сэрца, рвіце ўсе зносіны з п. Паўлюкевічам, бо гэта дарога вядзе да ашуканства і да згубы працоўнага люду!

Радны гмінны, Вялейскага павету, вёска Жоўткі. **Жоўтка Зьмітрок.**

Маленькі фэльетон.

Гісторыя аднаго зьезьду.

Ці ведае хто з вас, браткі, паноў-паслоў (быўшых)—Вэндзягольскага, Галку, Дуброўніка, Адамовіча?

Можа хто ведае, а мо' і няведае. Але бадай іх лепш ня ведаць!

Прыпомніў я іх тут, бачыце, таму, што і да гэтай пары яшчэ не магу ўстрымацца ад сьмеху пры думцы аб адным здарэньні, якое з імі здарылася.

Было гэта так:

Паглядзелі яны на калявдар, бачаць: бяда! — сем дзён толькі да канца Сойму засталося. А там... эх там!... дыэтаў не дадуць, дарэмна ў першай клясе не паедзеш;— трэба-ж за нейкую працу брацца.

А праца ведама, ня для іх паноў, гэта—больш мужыцкая справа. Мужык—хам,— затое ён больш рукамі, нагамі, плячамі працуе, я яны — паны — больш жыватом ды галавой.

Сабраліся гэта яны разам, дый давай радзіць, як пры новых выбарах у Сойм пралезьці.

Адзін—стогне, другі—крэкча, трэцьці—вохкае.—Бядуюць паны, што ня ведаюць, як зноў да сялян падлабуніцца.

— Цяпер мужыка не ашукаеш! — кажа (б.) пасол Адамовіч.—Гэта ён добра ведае, бо і сам пяць гадоў назад мужыком быў.

Уздыхнулі цяжка паны.

— Трэба,—кажуць, пераапрануцца ў мужыцкую вопратку, разьехацца па вёсках і пачаць агітаваць. Сяляне паверáць, дый зноў у Сойм выберуць.

— Гэта—ідэя! — крычаць паны. Але... як-жа з мовай? Мы пяць гадоў у Сойме з беларускай мовай змагаліся, а цяпер без яе на вёску ані крок! Пачнеш казаць папольску,—пазнаюць сяляне, што пан, пагоняць вон, дый яшчэ па карку дадуць.

Бядуюць паны.

— Трэба, — кажуць, неяк да беларусаў падыйсьці.

— Але да каго?

Прыпомнілі яны казённага „бялорусіна"—Умястоўскага. Пайшлі да яго. А той, ведама, як панам верна служыць:

— Рад старацца!—крычыць.

Пагаварылі паны, падумалі, парадзіліся і рашылі:

„Зьезд аб'яднаных сялянскіх партыяў" у Вільні склікаць.

Дзень назначылі сьвяточны — 27 лістапада, каб перад зьездам у касьцёле за памысьнасьць справы памаліцца!

Кажуць навет, што (б.) пасол Галка з нейкім штандарам (сьцягам) у руцэ перад касьцёлам на вернасьць „справе хлопскай" прысягаў.

Сабраліся паны, а да іх адвакаты Рачкевіч і Абрамовіч прысталі.

Прыехалі і сяляне. Паўнюткая саля была.

Пачалі паны кракадзілавы сьлёзы выліваць. Над сялянскай доляй бядаваць, дый залатыя горы дэкляраваць.

— Ніхто,—кажуць, вам нічога ня дасьць, толькі—мы! Сыпяць абяцанкамі, як з мяшка,—бяры, аж расьпяразвайся! Паны гавораць папольску.

А сяляне да іх пабеларуску:

— Прэч!

— Далоў!

— Вон!

— Ня будзем старых паслоў выбіраць:— вы ўсе здрайцы, ашуканцы!

— Праўдзівыя нашы абаронцы ў самаходах ня езьдзяць, а за кратамі сядзяць.

— Ціха! Ціха!—успакайваюць паны, а сяляне гудзяць, як лес у навальніцу.

Спужаліся паны, ды са злосьці давай сварыцца. Кажуць, што Умястоўскага дэлегат з п. Галкам у прэзыдыюме амаль насы сабе не паразьбівалі, ці чупрыны не павыдзяралі.

Дрэнь справа!—Ня могуць сяляне ніяк з панамі зьяднацца.

Прападае ўся надзея на мандат!

Трэба-ж неяк сытуацыю ратаваць.

Ускочыў, тагды, адвакат Абрамовіч, прачытаў нейкую карталюшку (і мусіць сам таго ня чуў, што чытаў). На салі шум, гоман, крык. Устаюць з мейсц сяляне, гавораць, крычаць хто як можа. Усё зьлілося ў шумным моры галасоў.

— Разхадзісь!—крычаць паны, а сяляне да іх кулакамі махаюць.

Нехта шустры пабег за сцэну,

А адтуль... чалавек з дзесяць паліцыі з асьпірантам на чале.—Тыя дык хутка ачысьцілі салю.

Разыходзяцца сяляне абураныя, наракаюць:

— Як?—мы за сотні кілямэтраў ехалі, час і грошы трацілі на тое, каб нас тут паны паліцыяй разганялі!...

Разьехаліся па дамах сяляне, як ня солана хлябаўшы.

А назаўтрае паны ў польскіх газэтах:

„Гістарычны зьезд"!

„Аб'яднаньне сялянскіх партыяў ziem Litewsko-Białoruskich"!

І гэтак далей і далей...

А за імі і Умястоўскі ў сваім „Беларускім Дні" паслушна:

— Гаў... гаў... гаў!..

. . . .

Дык вось як паны з „chłopami" (сялянамі) ядналіся, а паліцыя іх разьеднавала!

Сьмешна мне, калі ўздумаю...

А вам?! Бывалы.



Рэдактар-Выдавец: А. Выдрыцкі.

Друкарня Я. Левіна, Вільня, Нямецкая 22.